# Танец-гэта радасць і добры настрой.

У Ашмянах у чэрвені стартаваў абласны творчы «Этна-праект па бытавых танцах» з назвай «ЭтнаБУМ», які накіраваны на адраджэнне і захаванне мясцовых традыцый танцавальнай культуры.

З вялікім энтузіязмам і зацікаўленасцю атрымальнікі паслуг у аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў (АДЗІ) ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» ўспрынялі прапанову паўдзельнічаць у майстар-класе па беларускіх бытавых танцах. Пад кіраўніцтвам прадстаўнікоў Аддзела культуры і вольнага часу аг. Кальчуны рабяты з вялікім задавальненнем вучыліся танцаваць фальклорныя танцы «Кракавяк», «Нарэчаньку», «Млын». Добры настрой, радасць зносін, запал і танцавальная весялосць зарадзілі выхаванцаў АДЗІ на цэлы дзень.







